# *Летапіс пасёлка Любча*

У беларускага народа, як і у кожнага чалавека есць свой лёс і свае мінулае. Мае сваю гісторыю і мястэчка Любча Навагрудскага раена Гродзенскай вобласці. Паселак ,размешчаны на беразе магутнай, славутай ракі Неман, пакінуў для сваіх нашадкаў багатую і цікавую спадчыну. Бацькаўшчына – гэта наша гісторыя, у якую ўваходзіць кожны пражыты дзень. І калі мы звяртаемся да мінулага, мы заўсёды звяртаемся ў дзень сённяшні.

## *З гісторыі Любчы*

Высокі бераг ракі Неман быў выбраны для пасялення яшчэ ў глыбокай даўнасці. Адна з легенд расказвае, што ў сярэдзіне XIII ст. манах дамініканін Віт заснаваў тут манастыр.

Пасля заснавання біскупства, нашыя продкі паступова адыходзілі ад паганства і далучаліся да веры Бога нашага Хрыста. Садзейнічала гэтаму існаванне ў Любчы з 1250 г. першага на нашых землях манастыра ордэна дамініканцаў, які ў 1320 г. быў пераведзены ў г. Наваградак.

З найбольшай верагоднасцю, тут, у канцы 1250г. ці пачатку 1251 г. прыняў хрост па лацінскаму абраду будучы кароль Каралеўства Літва Міндоўг са сваей жонкай Мартай, якая паходзіла з Любчы. Адначасова з імі хрост прынялі 600 баярскіх родоў, якія называліся ліцвінамі. Разам з тым, некаторыя даследчыкі таксама лічаць, што Варута знаходзілася у раёне Любчы (у Любчы ёсць ручай Варок). Гісторык Алесь Жлутка ў сваю чаргу сцвярджае на значэнні Любчы ў гісторыі часоў Міндоўга, альбо Міндава, як піша ён у сваёй кнізе "Міндаў,

кароль Літовіі, у дакумэнтах і сведчаньнях". Паводле ягоных словаў, Любчу можна з упэўненасцю назваць рэзыдэнцыяй дамініканіна Віта, першага біскупа літоўскага, які жыў тут у сярэдзіне XIII ст., а вось каб сцвярджаць, што Любча была таемнай сядзібай Міндавага не стае пакуль аргументаў.

Спачатку першы літоўскі кароль Міндоўг аддаў Любчу кіеўскаму баярыну Андрэю Васільевічу Кіяну, які ратаваўся ў Наваградку, тагачаснай сталіцы Вялікага княства Літоўскага, ад татарскага нашэсця.

Пры Гедзіміне Любча ўжо была велікакняжацкім валоданнем.

Па іншых звестках, упершыню згадваецца ў 1401годзе ў нямецкіх хроніках, як аб'ект паходаў крыжакоў.

У 1428 Вітаўт перадаў Любча ў валоданне сваёй жонцы Ульяне. Большасці дакументаў час пачатку селішча ўпершыню згадвае Любчу пад 1499г., калі вялікі князь Аляксандр "дараваў двор "Любчу" Тодару Храптовічу, у наступныя гады яно даволі часта сустракаецца ў пісьмовых крыніцах.

Хучэй за ўсё паселішча мела ужо статус мястэчка. Ва ўсялякім разе ў дакументах 1517-1528 гг. у 1517 ад 15 снежня мястэчка Любча належала Міхалу Белковічу. Пацверджан Жыгімонтам яго дара Мартіну Мелешковічу. У гэтыя часы Любча згадваецца, як мястэчка.

У 1528 г. яго набыў віленскі ваявода Гаштольд. Ёсць версія, што пры ўжо пры Гаштольдах у Любчы існавалі драўляныя ўмацаванні

У 1547 году яе набыў стараста жмудскі, каштэлян віленскі, ваявода брэсцкі Ян Кішка. З Кішкаў пачынае росквіт Любчы.

Пра асаблівае месца Любчы ў гісторыі Беларусі сведчаць і пазнейшыя

падзеі: у XVI ст. мястэчка пераходзіць ва ўласнасьць да вядомага магната пратэстанта Яна Кішкі. Дзякуючы яму, мястэчка набыла вядомасць як буйны пратэстанцкі цэнтр.

Тут быў пабудаваны арыянскі храм, а пры ім школа, плябань і лякарня. У школе вывучалі гісторыю і філасофію, мовы, музыку, фізіку, мэдыцыну. Навучаліся тут не толькі пратэстанты, але і праваслаўныя, і каталікі. А ў 1582 у Любчы адбыўся арыянскі сінод, прыблізна ў той жа час завітаў у мястэчка і Сымон Будны. Так што, нездарма Караткевіч прывёў беларускага Хрыста (Юрася Братчыка ў рамане “Хрыстос прызямліўся ў Гародню”) менавіта ў Любчу. Тут, перад мурамі Любчанскага замка, пачынаецца гісторыя змагання "караткевічавага" Хрыста з царкоўнымі ліхвярамі – ён выступае супраць гандляра індульгэнцыямі, як некалі Мартын Лютар, заснавальнік пратэстантызму.

У 1606 годзе праз паўночна-заходнюю заставу Мінска выйшаў вялікі каран вазоў, нагружаных пажыткамі мяшчан, назаўсёды пакідаючых родны горад. Прычынай, прымусіўшай гэтых людзей сабрацца ў далёкі шлях, хутчэй за ўсё была самая звычайная неабходнасць, але, магчыма, яны былі кальвіністамі. Затое ініцыятарам перасялення добра вядомы – прадстаўнік магнацкага роду Беларусі Крыштаф Радзівіл. Менавіта ён, атрымаў у якасці пасагу ад сваёй жонкі Анны Кішкі не толькі каштоўнасці, але яшчэ і мястэчка Любча.Крыштаф Радзівіл, дабіўшыся дазволу ад караля, перасяляе у Любчу мяшчан з беларускіх гарадоў для хучэйшага эканамічнага развіцця мястэчка. Любча становіцца своеасаблівы гандлёвым цэнтрам з рэгулярным гандлем і кірмашамі і першым у вярхоўе Нёмана портам, з якога любчанскія купцы на ветразных стругах, лодках і баржах перапраўляюць разнастайныя тавары па ўсім прынеманскім краю.

Клапоцячыся пра далейшае эканамічнае развіццё Любчы, Радзівілы прадпрымаюць спробу павелічэння насельніцтва за кошт перасялення сюды гараджан з Мінска, Наваградка і іншых гарадоў.

У асяроддзі любчанскіх Радзівілаў існавала вялікая цікавасць да кнігі. Неўзабаве па атрыманні Любчы Крыштоф Радзівіл адчыніў пры зборы, які быў пабудаваны Янам Кішкам як арыянскі, а пасля пераасвечаны як кальвінскі, друкарню. Планаваў таксама пабудаваць паперню. У Любчанскай друкарні пад кіраўніцтвам Пётры Бластуса Кміта, яго сына Яна і Яна Ланге выдавалася духоўная і свецкая літаратура, навуковыя і навучальныя выданні па гісторыі, геаграфіі, хіміі, астралогіі, ветэрынарыі, медыцыне. Сярод іх трэці на Беларусі нотны зборнік (Любчанскі канцыянал, 1618, 1621), першы медычны дапаможнік («Хатнія лекі, сабраныя з размаітых аўтараў», 1616), першы зборнік мясцовага фальклору з тлумачэннямі на латыні і з прыведзенымі паралелямі з нямецкай і італьянскай моваў («Польскія прыказкі» Саламона Рысінскага).

На некалькі дзесяцігоддзяў Любча ператварылася ў кнігавыдавецкі і важнейшы цэнтар пратэстанцкага руху, абышоўшы па сваёй значнасці Вільню, дзе ў выніку Контррэфармацыі пазіцыі пратэстантаў вельмі аслаблі. Дзейнасць друкарні датычылася таксама літаратуры і культуры эпохі Рэнэсансу. Сярод выдадзеных твораў значнае, і нават пераважнае месца займала свецкая літаратура, і ў гэтым сэнсе Любчанская друкарня аспрэчвала манаполію Кракава. Дзякуючы мэцэнацтву Біржанскіх Радзівілаў, пры двары Радзівілаў сфармавалася кола паэтаў і літаратараў, якія ахвотна супрацоўнічалі з Любчанскай друкарняй. У Любчы выдаваліся творы мяшчанскай літаратуры аўтара Адама Уладыславіюша, папулярныя біблейскія гісторыі ў пераказе Самюэля Доўгірда, прысвячанні і эпітафіі вядомым асобам . 1621 г.- дата

выдання ў Любчы сумеснай эпітафіі на смерць Януша Радзівіла. Гэта падзея лічыцца праўдзівым пачаткам літаратарскіх асяродкаў не толькі пры двары Біржанскіх Радзівілаў, але і ў ВКЛ. Сярод Любчанскіх аўтараў былі Даніэль Набароўскі, Андрэас Лохіўса Скотус, Ян Рыбінскі і Беняш Будны, Саламон Рысінскі, Адам Уладыславіюш, Самюэль Доўгірд і інш.

У 1644 г. Любчы, дзякуючы намаганням новага ўладальніка Януша Радзівіла, ў другі раз было нададзенае Магдэбурскае права. Любча - адзінае мястэчка на Беларусі, якое мае два магдэбурскія правы і адпаведна два гербы.

Нягледзячы на гучныя перамогі Януша Радзівіла ў барацьбе с Багданам Хмяльніцкім,вялікі гетман не змог абараніць родную Любчу і ў 1655 г. мястэчка захапілі ўкраінскія казакі Залатарэнкі. Вялікая частка жыхароў Любчы была забіта ці вывезена на селішча ў Расію, храмы і друкарня разрабаваны, а замак часткова падарваны.

Адпомсціць жа Я. Радзівіл ужо не паспеў - у снежні гэтага жа года ён быў атручаны наёмнымі забойцамі. Спустошаная Любча пасля гэтых журботных падзей адышла да генерала каралеўскай гвардыі Багуслава Радзівіла. Галоўнай яго рэзідэнцыяй быў Слуцк, які ў гэты час стаў адным з асноўных культурных і навуковых цэнтраў Беларусі.

У 1659 г. у мястэчка зноў наведваюцца няпрошаныя госці – маскоўскія войскі пад кіраўніцтвам Хаванскага.Пасля ўсіх ваенных ліхалеццяў Багуславу Радзівілу давялося сур'ёзным чынам ўзяцца за аднаўленне мястэчка, але працы засталіся няскончанымі, бо ў 1669 г. Багуслаў памёр. Людвіка Караліна Радзівіл, якая атрымала Любчу пасля смерці бацькі, закладае мястэчка за 955 тысячаў злотых слуцкай княгіні Кацярыне Радзівіл, а тая, у сваю чаргу, аддае яго ў

арэнду тутэйшым месцічам.

У XVШ ст., калі Любча, як і іншыя маёнткі Радзівілаў біржанскай лініі, перайшла ў спадчыну нямецкіх князёў Нойбургаў. У 1715 г. у Любчы з'явіўся першы з часоў Радзівілаў каталіцкі храм - касцёл і місійная станцыя езуітаў. Падчас Паўночнай вайны Любча была спаленая шведамі. Памяць пра тыя падзеі захавалася ў назве Шведскі брод – ёсць такая мясціна каля Любчы.

Толькі ў 1738г. Еранім Радзівіл выкупіў нейбургскіе маёнткі і ўключыў іх у склад Нясвіжскай ардынацыі.

21 жніўня 1730г. страшэнны пажар, распачаты з двара езуітаў, знішчыў шмат хат у Любчы, пашкодзіў будынкі і кальвінісцкі збор . Інвентар 1792г. паведамляе, што ад самой цэрквы захаваўся толькі каменны падмурак. Такім чынам ад некалі славутага пратэстанцкага цэнтру захавалася хіба што назва – "Кальвінка", так мясцовыя жыхары зрэдку называюць... тартак, што месціцца якраз на месцы былога пратэстанцкаму храму.

Пасля падзелу Рэчы Паспалітай Любча адышла да Расійскай імперыі . Апошнімі з Радзівілаў, што валодалі Любчай, былі Дамінік і яго дачка Стафанія. У 1832 г. ў выніку шлюбу Стафаніі з сынам яе апекуна Львом Вітгенштэйнам, Любча пераходзіць ва ўласнасць нямецкага роду. У складзе Расійскай імперыі Любча на нейкі час зноў становіцца цэнтрам рэлігійнага жыцця, дакладней рэлігійнага супраціву. Расійскія ўлады гвалтам спрабавалі прымусіць уніятаў перайсці ў праваслаўе. Сярод тых, хто наважыўся выступіць супраць, быў і ўніяцкі святар з Любчы Адам Плаўскі. У выніку яго не толькі пазбавілі сану, але і выслалі ў Смаленскую губернію, адабралі ў яго дзяцей і адаслалі іх у праваслаўныя кляштары. А праз колькі год рэпрэсіі чакалі ўжо іншага любчанскага ксяндза – Яна Радкевіча, які склаў ліст пра парушэнні свабоды

веравызнання ў сваёй парафіі. У 1836 г. над мястэчкам ізноў узнялося полымя – страшэнны пажар не толькі знішчыў драўляныя пабудовы, але і значна пашкодзіў каменныя.	Няшчасце падштурхоўвае ўласнікаў да дзеянняў: Пётр Вітгенштэйн заключае дамову з арандатарам Вольскім, з мэтай правядзення прац па аднаўленні Любчы.

У 1904 году Любчу разам з 4.200 гектарамі зямлі купіла ў сваіх братоў Лідыя фон Пейкер (прозвішча маці кампазітара Набокава па другім мужы). Згодна звестцы за 1911 год ( газетны нататак ў "Менскіх губернскіх ведамасцях" і інфармацыю ў "Спісе землеўласнікаў Менскай губерні") у Пойкер было 3.676 дзесяцін зямлі разам з маёнткам Дзяляцічы. А ў братоў Фальц-Фэйнаў - па 1.524 дзесяціны ў кожнага.

У гады Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай войн Любча часта знаходзілася ў эпіцэнтры баявых дзеянняў і, як следства гэтага, даволі моцна пакутавала. .

Увосень 1915 гады германскія войскі занялі заходнюю частку Беларусі. Лінія фронта стабілізавалася. Па Навагрудчыне яна праходзіла паблізу Любчы, Шчорсаў, Карэлічаў,Баранавіч, па рэках Нёман і Сервэч. Зыходзячы з ваенных неабходнасцей, германскае камандаванне ў 1916 году прыступіла да будаўніцтва вузкакалейкі — ад станцыі Наваельня да лініі фронта. Для гэтага высякаліся лясы, рэквізаваліся коні. На будаўніцтве працавала практычна ўсё працаздольнае насельніцтва Любчы і наваколляў. Менш чым за год чыгунку пабудавалі.

Дзеля дастаўкі боепрыпасаў на фронт па самім мястэчку Любча праходзіла лінія фронту. У мястэчку і па сённяшні дзень засталіся ўцалелыя дзоты гадоў Першай сусветнай.

У сакавіку 1921 года(згодна з умовамі Рыжского дагавора)Любча разам з

іншымі гарадамі і мястэчкамі Беларусі ўваходзіць у склад буржуазнай Польшчы (да 1939 г.).

Каталіцкая рэлігія атрымала дадатковы штуршок да развіцця пасля смерці Лідыі фон Пэйкер, якая на пачатку 30-х гадоў заклала свае землі ў Віленскі банк, а ў 1935 г . іх разам з замкам выкупіў Навагрудскі саюз землеўладальнікаў, які і перадаў частку Любчанскага маёнтка польскім манашкам-уршулянкам. Яны заснавалі ў замку ў Любчы яслі для самых маленькіх дзетак, заняліся катэхізацыяй у школе.

Улетку манашкі ладзілі дзіцячыя летнікі, на якія збіраліся дзеці з Польшчы – Лодзі, Варшавы, Вадовіц. Увосень 1939 г . перад самым пачаткам вайны ў Любчы знаходзілася 18 манашак і больш за 180 польскіх дзяцей. Мела дзейнасць уршулянак і дабрачынны характар: яны дапамагалі мясцовым жыхарам, лячылі іх задарма, не зважаючы на канфесійную прыналежнасць. На самым пачатку Другой сусветнай вайны, увосень 1939 г ., манашкі далі прытулак і дапамогу бежанцам з Польшчы, у чым іх значна падтрымала мясцовая яўрэйская супольнасць на чале з равінам. Польскія манашкі здолелі аб’яднаць вакол сябе прадстаўнікоў рэлігійных плыняў у Любчы.

З 1940- 1954(56) –Любча- раённы цэнтр Баранавіцкай вобласці.

З чэрвеня 1941 г. па 08.07.1944г. Любча акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У час Вялікай Айчыннай вайны тут дзейнічаюць партызанскія брыгады Дзенісенкі і Чайкоўскага, падпольныя райкомы КП(б)Б і ЛКСМБ. У паселку есць вуліца, названая ў гонар камандзіра партызанскага атрада М.Чайкоўскага.

Любча - адно з самых старажытных мястэчак Беларусі. Гаштольды, Кішкі, Радзівілы, Фальц-Фэйны, Вінгенштейны, Набокавы: гэтыя магнацкія

роды былі ў свой час самымі магутнымі на тэрыторыі Беларусі. Кожны з уладальнікаў спрыяў культурнаму, духоўнаму жыццю Любчы,пачынаючы са шматлікіх паганскіх капішч, якіх каля Любчы нямала,і аж да пачатку XX ст. У Любчы найбольш яскрава праяўляліся агульныя тэндэнцыі ў рэлігійным жыцці краіны Большасць каталіцкіх ардэноў мелі свае прыходы ў Любчы: дамінікане, арыянцы, кальвіністы, іезуіты.

## *Легенды пра Любчу*

Назва Любчы паходзіць ад чыста беларускай асновы "любая", гэта значыць каханае, аблюбаванае месца. Відавочна, і даўней гэтае маляўнічае нёманскае прырэчча часта выбіралася, аблюбоўвалася для сустрэч, ігрышчаў, рытуалаў. Не выпадкова мясцовая легенда злучае назву Любчы з імем князя Міндоўга, які перапраўляючыся праз раку Нёман сустрэўся тут са сваёй будучай жонкай Мартай, пасля першай каралеўнай у гісторыі Вялікага княства Літоўскага. У гонар кахання да яе Міндоўг назваў селішча Любч, Любеч.

---

Стаяў недалёка ад Нёмана дом. Жыў у ёй дзед са сваёй унучкай-сіратой, а ў гэтай дзяўчыны былі вельмі прыгожыя вочы.

Нияк раз сустрэлася дзяўчына з цыганкай:

-Ой, прыгажуня, дай павараджу! Усю праўду скажу. Пазалаці ручку.

Дзяўчына падала ёй руку.

-Ой! Вялікае каханне чакае цябе. Але чырвоная дама загубіць яго. Усё! Больш гаварыць не буду. Бывай, прыгажуня.

-Пачакай! Раскажы далей!

Жыццё ішла сваёй чаргой, але словы цыганкі не давалі спакою.

Аднойчы ехаў каля берага Нёмана малады князь. Убачыў дзяўчыну, спыніўся, паглядзеў у яе васількова вочы і закахаўся.

-Хто ты, прыгажуня?

-Люба, дзядуля Любава кліча.

-Не ведаў, што ў гэтым краі ёсць такія прыгажуні. Да сустрэчы, Любава.

Сказаў гэта князь і паехаў у свой двор. І надышлі для яго дні сумныя, страціў ён спакой і сон, не можа забыцца Любаву. Пачаў з ёй шукаць сустрэч. Знайшоў на тым месцы, дзе сустрэліся. І пачаліся ў іх таемныя сустрэчы.

Дайшлі чуткі да Князевай жонкі. Раззлавалася княгіня, паклікала слуг і загадала знішчыць дзяўчыну.

Падслухаў гэта маленькі паж і пабег Любаве расказаць.

-Любава, княгіня пасылае слугаў знішчыць цябе. Уцякай! Хавайся!

Пабегла Любава, спынілася на беразе Нёмана, упала на калені, працягнула рукі да неба і шэпча:

-Грэх на мне вялікі, Госпадзі! Не замужам я, пакахала жанатага і багатага. А грэх ці любіць? Няма мне месца на зямлі, пусці мяне да неба.

Расступіўся Нёман і пусціў дзяўчыну.

Дачуўся князь пра смерць сваёй каханай, прыбег на бераг Нёмана і стаў клікаць:

-Люба! Любава, каханая! Дзе ты? - А рэха адказвае - Любач ... Любач ... Любча.

Пацягнуліся на тое месца хлопцы і дзяўчаты, любілі сустракацца тут. Ўтварылі сем'і, пабудавалі хаты. Так і з'явілася паселішча Любач, якое потым сталі клікаць Любча.

---

Распавядаюць, што шмат гадоў таму на беразе Нёмана стаяла царква. Маладыя, якія збіраліся пажаніцца, прыходзілі да яе алтара прасіць блаславення. І жыла ў той вёсцы адна дзяўчына - такая ганарлівая і пераборлівыя, што ніхто яе не любіў. І вось прыйшла яна аднаго разу ў царкву, стала на калені і пачала скардзіцца Богу: «Чаму я не такая, як усе. Чаму мяне ніхто не любіць ». І падчас

малітвы глядзіць вакол, можа, паглядзіць на яе хто-небудзь з хлопцаў.

Раззлаваўся Бог і адказвае ёй: «І сапраўды, чаму ты не такая, як усе! Чаму нават памаліцца не можаш, як усе! ". Дзяўчына раззлавалася, ускочыла з каленяў і закрычала: «Калі мяне не любіць, так і цябе кахаць ніхто не будзе!». І яна ўзяла і спаліла царкву.

Але людзі не забыліся пра святое месца. І закаханыя па-ранейшаму прыходзілі на тое месца, дзе стаяў алтар. І празвалі яго, а разам з ім і ўсю вёску - Любеч - на знак вечнай любові.

---

### *Рака Нёман*

Любча размешчана на беразе магутнай, славутай ракі Нёман.



Пачынаецца пад назвай Неманец на Стаўбцоўскай раўніне каля в Верх-Нёман Уздзенскага раёна. Упадае ў Куршскі заліў Балтыйскага мора. Асноўныя прытокі: Уса, Сула, Бярэзіна, Дзітва, Лебяда, Котра, Мяркіс, Вілія, Невежис, Ушша, Моўчадзь, Свіслач. Рэчышча ад вытока на працягу 26,4 км каналізаванае, далей-звілістае, шмат мялізнаў, перакатаў, кос, пясчаных астраваў. Шырыня ракі ля паселка Любча складае 40-50 метраў. Дно пяшчанае, на перакатах пясчана-камяністае і глеістае. Плынь спакойная з сярэдняй хуткасцю 0,6-0,8 м / с і ваганнямі ад 0,2 м / с да 2 м / с (у разводдзе). Калі адбываецца веснавое разводдзе, то працягваецца 30-40 дзён. Найбольшае разводдзе за апошнія 150 гадоў назіралася жыхарамі паселка ў 1958г., калі ўзровень вады падняўся да 5,5

м.  Хаты любчан,размешчаныя паблізу берага,амаль на палову былі затопленыя, і даводзілася перамяшчацца на лодках і плытах  Замярзае Нёман ў другой палове снежня, найбольшая таўшчыня лёду 54-63 см, крыгаход пачынаецца ў канцы сакавіка. Вясновы крыгаход працягваецца 7-16 сутак. Вада ў рацэ па гідрабіялагічных паказчыках умерана забруджаная, выкарыстоўваецца для бытавога і прамысловага забеспячэння. Рэгулярнае суднаходства і лесасплаў не ажыццяўляецца.

Вялікім скарбам, асабліва для мясцовых рыбакоў,з'яўляюцца азеры,размешчаныя ў пойме ракі: Сінявіца,Чарэдніца, Стары Неман, Раманчыкава, Баброва, Пісарава Яма,Святое, Лявонкава , Перакоп , Затока.

У вадаёме жыве нямала відаў рыб. Гэта датычыцца ў першую чаргу ласося, асетра, харыуса, фарэлі. Зменшылася колькасць звычайных насельнікаў Нёмана: плоткі, акуня, шчупака, ляшча. У Нёмане і яго прытоках ў большай ці меншай ступені водзяцца уклея, пячкур, ёрш, ялец, плотка, акунь, шчупак, галавень, сазан, язь, лешч, чырвонапёрка, мянтуз, радзей - сом, судак, вусач, стронга. У мясцовых азёрах найбольш часта сустракаюцца пячкур, ёрш, плотка, сярэбраны і залацісты карасі, шчупак, лешч, лінь, вугор.

***з гісторыі***

Вядомы факт пераправы праз раку Нёман французскіх войск на чале з Напалеонам у 1813 годзе.

У гады ВАв 44  вайсковым злучэнням і  героям,   якія  праявілі гераізм   у баях  за  Нёман, у 1944 прысвоена  ганаровае званне «Нёманский»;  у тым ліку французскі  авіяполк  названы  «Нармандыя-Неман»

---

У 2 кіламетрах ад Любчы, пры дарозе на Далятычы, б'е чыстая, крыштальная крынічка.Некалі гэтае месца ўшаноўвалася як святое. Тут, пад старой ліпай стаяў храм, які застаўся ў памяці людзей як Падліпка. Сёння на яго месцы жвіровая дарога і пустая бязлесая ўзбочына. З крынічкай звязана цікавая легенда,згодна з якой, ідучы, Божая Маці ступіла на камень, і з-пад яго забіла гаючая крыніца. А з тае крыніцы вырасла ліпа.

## Любчанскі край ва ўмовах ваенных выпрабаванняў

1 верасня 1939 года фашысцкая Германія напала на Польшчу. Гэтай падзеяй пачалася Другая Сусветная вайна.

Беларусь прымала ўдзел ва ўсіх буйных бітвах Вялікай Айчыннай вайны. Актыўна ўдзельнічаў у партызанскай і падпольнай барацьбе супраць нямецка – фашысцкмх захопнікаў народ Любчанскага краю. У гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Любчанскага раёна ствараліся падпольныя партыйныя і камсамольскія арганізацыі. Сярод іх выдзеліліся сакратар падпольнага камітэта КПЗБ Кунейка А.П., Кунейка И.П., Малуха И.А., П. Сечка і іншыя.

У аддзеле вайны Народнага музея Любчанскага краю паказаны першыя дні вайны на тэрыторыі Любчы. Здымкі гавораць аб першай бамбежцы Любчы. Самалёты бамбілі Любчанскі мост. На захопленай тэрыторыі немцы стварылі лагеры смерці, дзе былі знішчаны многія грамадзяне Гродзеншчыны. Тры гады і 23 дні працягвалася фашысцкая акупацыя Гродзенскай вобласці. За ўсю шматгадовую гісторыю Прынеманскі край не зведваў такіх жудасных учынкаў. Нямецкія акупанты за час вайны па Гродзенскай вобласці забілі 176 530 мірных жыхароў. У Гродна 33 тысячы, у гэтым ліку і яўрэйскае насельніцтва. Толькі на Любчанскіх могілках было расстраляна каля тысячы чалавек разам з яўрэямі.



месца быўшага яўрэйскага гета (цяперашні Дом культуры)

З успамінаў старэйшых жыхароў паселка Любча: Чарамшагінай В.П.(1924 г.н.) і Пальчык М.І.(1926 г.н.)

“У Любчу фашысты прыйшлі ў пачатку ліпеня. Першы дзень іх прыходу быў адзначаны пагромамі: яны забілі 12 чалавек. Да гэтага часу фашысцкія лётчыкі-піраты разгramілі два пантонныя масты і спалілі ўсходнюю частку пасёлка. Згарэла чыгуначная станцыя, лесазавод, мноства грамадскіх і жылых будынкаў.

У жніўні 1941 года нямецка-фашысцкія акупанты стварылі ў г.п.Любча гета (гэта сённяшняя Наднёманская вуліца - ад лясніцтва да ДК). Туды сагналі больш за 1600 яўрэяў: з Любчы, прылеглых вёсак, а з Іванцоў больш за 100 чалавек. Сярод іх быў лекар Рабіновіч з сям'ёй. Ён бы мог выратавацца, але пажадаў быць з сям'ёй.

Неўзабаве пачаліся масавыя расстрэлы. З Любчы фашысты вывелі 1600 чалавек яўрэяў, якія тут раней пражывалі. Тых, хто мог ісці, пагналі ў бок в.Вараб’евічы, а слабых - жанчын, дзяцей, старых - вялі за пасёлак у бок в.Далятычы(375 чалавек) і расстралялі каля ям, якія былі выкапаны раней. Гэта было вясной 1942 года.

У 1958 годзе на магіле ахвяр фашызму пастаўлены абеліск.”

Нямецка – фашысцкія захопнікі планавалі засяляць Гродзенскую вобласць нямецкімі сялянамі. Гэта азначала ператварыць мясцовае насельніцтва ў рабоў, нямецкіх каланістаў. Па загаду Гітлера Беластоцкая вобласць, у тым ліку і Гродна, былі ўключаны ў склад Германскай III імперыі, а горад Гродна пераіменаваны ў Гартэн.

У Прынеманскім краі пачала арганізоўвацца партызанская брыгада імя Дзяржынскага, камандзірам якой стаў Шашкін К., родам са Слоніма. У Любчанскім, Карэліцкім, Стаўбцоўскім раёнах стваралася партызанская кавалерыйская брыгада пад кіраўніцтвам Дзенісенкі Дзмітрыя Анісімавіча. Захопнікі вельмі баяліся гэтага атрада і ставілі сваёй мэтай узяць у палон жывым камандзіра брыгады. Але гэта немцам здзесніць не ўдалося.

Партызанскія атрады, брыгады нанасілі вялікія ўдары па ворагу. Многія выпускнікі школы прымалі актыўны ўдзел у барацьбе з фашыстамі.

У баі з акупантамі смерцю храбрых загінулі любчане Мікалай Анікейчык, Адольф Барысевіч, Аляксандр Дзяргач, Міхаіл Богуш, Вікенцій Несцяровіч. Раніцай 8 ліпеня 1944г. партызанскія брыгады і перадавыя часткі Чырвонай Арміі, выгнаўшы захопнікаў, увайшлі ў Любчу. Гэтым боем партызанская брыгада імя Дзяржынскага завяршыла свой гераічны шлях і пасля ўз’яднання з часцямі Савецкай Арміі была расфарміравана. Асноўная маса асабовага саставу ўлілася ва ўзброеныя сілы для поўнага разгрому фашысцкіх захопнікаў, а частка былых народных мсціўцаў накіравана для работы ў партыйныя, савецкія гаспадарчыя структуры. Мінулі гады. Бяссмяротны іх подзвіг будзе жыць вечна.

Слаўны след у гісторыі Вялікай Айчыннай вайны пакінулі мужнасць і

патрыятызм Людмілы Сечка, ураджэнкі в.Чарэшля, вучаніцы Любчанскай СШ.

Яе подзвіг высока быў ацэнена ў свой час ўрадам рэспублікі Беларусь Многія вуліцы названы іменем  Л.Сечка. Яна атрымала ордэн Вялікай Айчыннай вайны I ступені. На тэрыторыі Любчанскай сярэдняй школы быў пастаўлены бюст, аўтарам якога з'яўляецца былы выпускнік школы Грос Віктар.

На адкрыцці помніка прысутнічалі прадстаўнікі вобласці, раёна, камсамольскія і піянерскія дэлегацыі. Выступалі першыя сакратары Навагрудскага РКЛКСМБ  Аляксандр Міхайлавіч, сакратар абластнога камітэта Рабко і іншыя. Іменем Л.Сечка названа пярвічная арганізацыя БРПА і БРСМ Любчанскай СШ.



Ветэраны вайны і працы заўсёды былі ў пашане пасялковага савета і Любчанскай сярэдняй школы:

Кунейка Антон Паўлавіч  1890 г.н.,

Сечка Павел Іосіфавіч  1896г.н.

Капціловіч Аляксандр Цімафеевіч 1923 г.н.

Крупіч Сямен Трафімавіч 1915 г.н.

Капціловіч Кірыл Андрэевіч 1913 г.н.

Носко Міхаіл Міхайлавіч 1917 г.н.

Канашэнка Георгій Васільевіч 1923 г.н.

Баршчэўскі Вікенцій Іосіфавіч 1920 г.н.

Хількевіч Аляксандр Фаміч 1924 г.н

Аляшкевіч Аляксандр Паўлавіч 1925 г.н. і інш.

Дзенісенка Дмітрый Анісімавіч.

Удзельнік вялікай Айчыннай вайны. У тылу ворага быў арганізатарам партызанскага руху Гродзенскай і Мінскай абласцей. З'яўляўся арганізатарам партызанскага атрада, які затым перарос у першую кавалерыйскую брыгаду Баранавіцкай вобласці. Кавалерыйская брыгада па баявому дзейнічала ў Стаўбцоўскім раёне. Брыгада карысталася аўтарытэтам мясцовага насельніцтва. Кавалерысты наносілі жудасныя нападзенні на нямецкія і паліцэйскія гарнізоны, якія павінны былі быць знішчанымі ў засадах. Нямецкія фашысты абяцалі шмат грошай і іншыя ўзнагароды таму “хто заб’е Міцьку”, такі быў псеўданім Дзенісенкі Д.А.

Як баявы камандзір з ручным кулямётам у руках Дзенісенка Д.А. заўседы удзельнічаў у баях і аказваў дапамогу там, дзе было асабліва цяжка. Сярод партызан і насельніцтва заслужыў павагу і аўтарытэт. У баях быў смелым. Быў некалькі разоў паранены. За смеласць і мужнасць і актыўны удзел у партызанскім руху быў узнагароджаны Ордэнам Леніна, ордэнам Вялікай Айчыннай вайны І ступені, медалем партызану Вялікай Айчыннай вайны І ступені і ІІ ступені, медаль за Перамогу, а пасля вайны медаль за доблесную працу ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вызвалення працаваў намеснікам старшыні РВК у Мірскім раёне, быў абраны членам РККПБ, членам бюро Мірскога РККПБ. Прымаў актыўны удзел у вазабнаўленні разбуранай вайной народнай гаспадаркі, а таксама ў арганізацыі калектывізацыі. Затым працаваў

наменсікам старшыні РВК Ляхавіцкага раёна Баранавіцкай вобласці. Затым працаваў старшынёй калгаса імя Жданава Навагрудскага раёна, затым старшыней Любчанскага гарісполкома. Уся праца Дзенісенкі Дзмітрыя Анісімавіча была яркім прыкладам служэння сваёй Радзіме. Памер і пахаваны ў Любчы. .

---

Аляшкевіч Аляксандр Паўлавіч.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, настаўнік матэматыкі Любчанскай сярэдняй школы.

Аляксандр Паўлавіч амаль 40 год выкладаў матэматыку ў Любчанскай сярэдняй школе. Працаваў інспектарам РАНО, дырэктарам вячэрняй школы, наменсікам дырэктара па вучэбна – выхаваўчай рабоце ў ВВК. Вялікі прафесіянал, цудоўны чалавек, актыўны удзел прымаў ва ўсіх мерарыемствах, паказваў прыклад адносін да працы. Вельмі добра памятае баявыя дзеянні ў гады вялікай айчыннай вайны. Быў прызваны ў армію ў 1944 годзе. Асаблівае ўраджанне засталося ў памяці пра фарсіраванне Одэра. У час фарсіравання рота, у якой служыў Аляксандр Паўлавіч, рыхтавала плацдарм для наступлення – перапраўляла на другі бок міны і калючы дрот. Немцы змагаліся вельмі смела. Усё пераправілі, засталіся толькі перапраўшчыкі і хлеб у мяшках. Але не паспелі гэта зрабіць, як у іх трапіў нямецкі снарад. Дно лодкі было прабіта і ў вадзе аказаўся хлеб. Аляксандр Паўлавіч вады не баяўся, бо вырас на Немане, але боты, адзенне і аўтамат цягнулі на дно. Са сваім сябрам не ўпусцілі хлеб. Пераправіўшыся, бачылі, як па вадзе плылі салдацкія шапкі. Аляксандр Паўлавіч сярод іншых пакінуў свой подпіс на сценах Рэйхстага, прайшоў у парадзе па ляжачаму ў руінах Берліну і вярнуўся дамоў, каб выканаць намечаныя планы. Сустрэў сваю любімую жонку Клаву Рыгораўну. Яны

вырасціла трох дзяцей.

Аляксндра Паўлавіча, таленавітага выпускніка Баранавіцкага педагагічнага інстытута, запрашалі працаваць у Пінск, але ён застаўся на сваёй маленькай Радзіме.Выкладаў матэматыку ў Любчанскай сярэдняй школе. Быў дырэктара вячэрняй школы, намеснікам дырэктара ВВК, затым дырэктарам. Аляксандра Паўлавіча часта запрашаюць у школу на сустрэчы. Ён заўсёды ахвотна прымае запрашэнні.

***Помнікі ахвярам Вялікай Айчыннай вайны ў г.п. Любча***



Помнік загінуўшым воінам і партызанам
у гады Вялікай Айчыннай вайны на плошчы Салабуціна



***Помнік яўрэйскай абшчыне***

Яўрэі Любчы ўнеслі вялікі ўклад у развіццё пасёлка.
У гады Халакоста з 1941 па 1944 год нацыстамі было знішчана каля 1500

яўрэяў: мужчын, жанчын і дзяцей.
Помнік устаноўлены на месцы яўрэйскіх могілак ў чэрвені 1999 года.



Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан.
Пахаваныя 7 воінаў 69-стралковага корпуса, 49 арміі, 2-га Беларускага фронту і партызаны брыгады ім. Дзяржынскага і партызанскага злучэння Лідскай зоны, якія загінулі 1944/07/08 года пры вызваленні пасёлка ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў
У 1956 годзе на магіле пастаўлены абеліск.

Флора і фауна

Вялізны лясны масіў, званы Налібоцкай пушчай ,у склад якога уваходзіць Любчанскі лес, з'яўляецца найкаштоўнейшым прыродным сховішчам дзікарослых раслін і найбагатай фауны. Гэта «зялёныя лёгкія» паселка . Лес

размешчаны ў Неманскай нізіне, у 2 км.ад ракі .   Тут можна ўбачыць нямала парод дрэў: сосны, бярозы, елкі, ліпы, асіны , клены,дубы,вязы. Сустракаецца некалькі відаў сасны : сасна звычайная, сасна Банкса, сасна Веймутава, сасна Мурэя. Паўсюдна таксама  сустракаюцца бук, граб, туя, лістоўніца,піхта,  вольхі, тапалі, івы. Маюцца экзоты - дуб чырвоны, каштан конскі і інш Выяўлены расліны, занесеныя Ў Чырвоны кнігу РБ: баранец звычайны, валдырнік ягадны, дрэмлік цемна-чырвоны, жывучка пірамідальная, зубянка клубняносная, вярба чарнічная, званочак шыракалісты , крыжавік прырэчны.Тут растуць лекавыя, дэкаратыўныя, кармавыя, меданосныя, тэхнічныя віды раслін. Сустракаецца расліна, якая мае патрэбу ў прафілактычнай ахове -першацвет вясновы.Шмат месцаў вырастання чарніцы, брусніцы, маліны, суніцы, куманікі, парэчкі чорнай і чырвонай, каліны, рабіны, дурніцы. У рэдкіх забалочаных нізінах увосень можна збіраць журавіны.

Расліны, занесеныя ў Чырвоную кнігу РБ



Жывелы і птушкі, якія прапісаліся ў Любчанскім лесе, звязаныя радаводам з многімі кліматычнымі зонамі. Тайговымі жыхарамі прынята лічыць лася, рысь, вавёрку, зайца-беляка, глушца. Мядзведзь амаль не сустракаецца і ,як і іншыя рэдкія жывёлы, знаходзіцца пад аховай дзяржавы.

За апошні час, дзякуючы клопатам чалавека, у лясах значна вырасла пагалоўе іншага каштоўнага звера - лася. Лось пастаянна адчувае да сябе добразычлівыя адносіны чалавека: зімой жыхары паселка сумесна з работнікамі Любчанскага лясгаса падкормліваюць лосей, мабыць, таму ён не вельмі баіцца прысутнасці чалавека, даверліва прыходзіць на калгасныя пашы, а часам іх можна ўбачыць зусім паблізу ад паселка.

Немагчыма ўявіць лес і без дзіка. Статкі гэтых асцярожных звяроў выбіраюць для пражывання лясныя нетры і іншыя цяжкадаступныя месцы. Яны імкнуцца пазбягаць сустрэч з чалавекам. Але калі яна адбылася, то кабан ў цяжкую хвіліну здольны пастаяць за сябе і сваіх падапечных. Не аднаму паляўнічаму прыйшлося пасля няўдалага стрэлу шукаць выратаванне на дрэве. Колькасць кабаноў ў лясах таксама рэгулюецца органамі аховы прыроды.

Водзяцца ў лясах і ваўкі. Праўда, засталося іх не так ужо шмат, і рассяліліся яны нераўнамерна. Дзе-нідзе ваўкі наносяць шкоду іншым лясным насельнікам, пры выпадку не супраць напасці і на хатніх жывёл. Там вядзецца іх адстрэл. У некаторых месцах ваўкоў вынішчылі цалкам, і зараз сярод паляўнічых, работнікаў лясной гаспадаркі ўсё часцей раздаюцца галасы ў іх абарону.



Амаль ля самага лесу можна сустрэць паселішчы бабра. Яго прысутнасць выяўляецца па перапіленых магутнымі разцамі дрэвах. Ніжэй месца свайго пасялення яны ладзяць гаці, а то і сапраўдныя плаціны. Бабровае возера ля ракі Неман –месца пасялення неманскіх баброў.

З іншых прадстаўнікоў фауны ў лесе жыве лясная куніца - драпежнік, які знішчае вялізарную колькасць мышападобных грызуноў. Зрэшты, яна не грэбуе і іншымі дарамі лесу: мёдам, ягадамі. Гэта асцярожная і спрытная істота, сустрэць яе не проста. Жыве куніца ў старых лістовых лясах.

Яе супернік - лясны тхор-больш шматлікі, і, мабыць, больш прадпрымальны. Пры выпадку ён не супраць паласавацца хатняй птушкай.

Здаўна жывуць у невялікай колькасці выдры, гарнастай,  рудыя лісы, заяц-русак і, радзей,заяц-бяляк, казуля.





куніца

Птушкі -шэры журавель, чорны бусел, малы падворлік, чаглок, звычайная пустальга, звычайны зімародак, белая курапатка, пугач, даўгахвостая няясыць, зялёны дзяцел,сава, лятучая мыш,сізаваронка,змеяяд і інш.

Занесены ў Чырвоную кнігу РБ



Ч.кніга



**Глеба**

Глебы дзярнова-падзолістыя,падзолістыя,пясчаныя ,чарназем. Дзярнова-балотныя глебы ў пойме ракі Неман .

**Ландшафт**

Прадстаўлены плоска - хвалістай раўнінай, размешчанай у Неманскай нізіне.

**Любчанскі замак**

У 1581г. Янушам Радзівілам было распачата будаўніцтва каменнага замка. Менавіта такая дата выразана на сцяжку старажытнага флюгера - «ветраніка», які знайшлі мясцовыя краязнаўцы.На ім прысутнічае герб Кішкі. Ужо ў 1588 г. быў складзены першы інвентар Любчы і Любчанскага замка. Пабудаваны на высокім левым беразе Нёмана. Прамавугольны ў плане, быў умацаваны валунамі, з захаду, поўдня і ўсходу - ровам (шырыня-каля 30м, глыбіня - 7-10м.). На паўднёвым-захадзе і паўднёвым усходзе па кутах размяшчаліся 2 мураванаыя вежы. Паўднёва-заходняя вежа мела форму куба, які на вышыні 8м пераходзіць у 8-граннай прызму. Падмурак быў складзены з вялікіх камянёў на вапне, вышыня 3,85 м., вежа мела 4 ярусы бою. Аб'ёмна-пrасторавай кампазіцыяй вежа падобная да вежы Мірскага замка-паркавага комплексу і да некалькіх абарончых вежаў Віцебскага Верхняга замка. Спачатку вежа была, відаць, адной мураванай ў драўляным замку, пра што сведчыць праслоа, якое прымыкае да яе мураванай сцяны, і 2-я кутняя паўднёва-ўсходняя вежа, якая адрозніваецца формай, памерамі і ренесансавай муроўкай. Яе пабудавалі, хутчэй за ўсё, у пачатку 17ст., таму што на гербе Любчы, атрыманым у 1644г., намаляваны 2 вежы. Яна таксама стаіць на падмурку вышынёй каля 4м. У вежы былі 3 яруса бою. Прасла замкавай сцяны паміж вежамі таксама ренесансавай муроўкі мела таўшчыню 1,3 м. на паўднёвым баку замчышча, паміж 2 невялікімі вежамі размяшчаўся палац. Вежы мелі бляшаныя дахі, на якіх знаходзіліся флюгеры з гербам Радзівілаў. Паўднёва-заходняя ўязная вежа замыкалася дубовай брамай, перад ёй праз роў быў перакінуты пад'ёмны мост. Пад вежай размяшчаліся скорбец і вязніца. На сцяне, звернутай у бок замкавага подворка, знаходзіліся гадзіннікі. Справа ад уваходу было каравульнай памяшканне, ва ўсходняй частцы замкавай сцяны - фортка, якая выходзіла на другі мост. У 1655г. Любчанскі замак быў узяты казакамі І. Залатарэнкі. У 18 ст. замак страціў сваю абарончую здольнасць. Згодна з апісаннем Любчанскага замка за 1813 г., тут былі толькі 2 вежы, 2 масты злучалі замак з мястэчкам і фальваркам.

Падчас Першай сусветнай вайны замак быў знішчаны, а з яго астанкаў збудавалі сярэднюю школу. Дзве ўцалелыя замкавыя вежы прадстаўляюць вялікую гістарычную каштоўнасць

Ідэя аднаўлення замка з мэтай   стварэння ўнікальнага турыстычнага маршруту паўстала напачатку 80-х гг. У 150 кіламетрах на поўнач ад Любчы ўжо аднаўляўся Мірскі палац, а на такой жа адлегласці на захад ад Любчы- замак у Навагрудку.
Аднаўленне Любчанскага замка пачалося ў 2003 г. з археалагічнага і архітэктурнага даследавання і адначасовым праектаваннем рэстаўрацыі.Узначаліў рэстаўрацыйныя работы ўраджэнец г.п. Любча Пячынскі І.А.Для зберажэння Любчанскага замка былі пастаўлены наступныя задачы: кансервацыя руін вежы ранняга рэнесанса, які характарызуе стадыю выкарыстання агнястрэльнай зброі; частковае аднаўленне і музеефікацыя ўмацаванай рэзідэнцыі, створанай у канцы XVI ст. , з мэтай стварэння цэнтра культуры і турызму на тэрыторыі Беларусі.
Прыярытэтным стала выратаванне ўцалелых арыгінальных  веж, байніц і іншых частак замка . У фазе рэалізацыі выкарыстоўваюцца матэрыялы, метады і тэхналогіі гістарычных будаўнічых рамёстваў,  арыгінальныя вапнавыя растворы, арыгінальныя тэхналогіі і тэхніка.
На  абодвух паверхах палаца плануецца размясціць жылыя памяшканні. У паўднёвым корпусе рэзідэнцыі-сталоўку. На ніжніх паверхах флігеля будзе жыллё службоўцаў, склады, склеп, стайня, а ў варот - вартаўнічы пост. Прадугледжваўся размяшчэнне мясцовага краязнаўчага музея .
Галоўная задача рэстаўрацыі з’яўляецца адлюстраванне Любчанскага замка як помніка ў кантэксце гісторыі і культуры Беларусі з сярэдзіны XV  да пачатку XX стст.

На тэрыторыі замкавага комплексу ў рамках праграмы "Жывы музей" штогод арганізоўваюцца мерапрыемствы, злучаныя з пазнаваннем спадчыны культуры і побыту XV-XVII стст. (фэст старадаўняй музыкі, спектаклі і інш.), дзе наведвальнік музея становяцца актыўнымі удзельнікамі інсцэніровак гістарычнай падзеі ці звычайнага побытавага працэсу (настольных гульняў, змаганняў, старадаўніх танцаў і інш.). Музей дае магчымасць спазнаць, пацешыцца, адпачыць і ўзбагаціцца.

Любчанскі замак гэта першая спроба рэстаўрацыі помнікаў на дабраахвотніцкіх пачатках.Любчанскі замак на Беларусі назаўсёды застанецца помнікам Беларускага Энтузіазму.

Любчанская друкарня. Існавала ў 17 ст. у г.п. Любча ў маёнтку князя Радзівіла. Заснавана, верагодна, Пятром Бластусам Кмітам, які ў 1612. прывёз сюды друкаванае абсталяванне з Вільні. Друкарня абслугоўвала ў большасці запыты кальвіністаў, зрэдку прымала заказы і ад каталікоў. За 20 гадоў Кміта выдаў 59 кніг на польскай і лацінскай мове па гісторыі, медыцыне, філасофіі. З 1632г. друкарню узначальваў сын Кміты Ян Даніэль, які выдаў кнігу арыянскага аўтара І. Шліхтынга «Аб св. Троіцы супраць Балтазара Мейснера »на лацінскай мове (1639г). У 1646г - 1655г. кіраўніком друкарні быў Янг Ланге, які выдаў 14 кніг пратэстанцкага напрамку. У 1650 некалькі разоў выходзіў «Каляндар гадавых свят і рухаў нябесных цел» С. Фурмана. З друкарняй супрацоўнічаў гравёр К. Гетке. Упершыню ў беларускім кнігадрукаванні для ілюстравання выданняў шырока выкарыстоўвалася гравюра на медзі.

**Любчанскі парк.**

Помнік садова-паркавага мастацтва ў г.п. Любча
Створаны ў першай палове XVIII стагоддзя на левым беразе р.Неман. Парк рэгулярнага тыпу. На квадратным ўнутраным двары замка размешчаны круглы партэр з калцавымі пасадкамі дэкаратыўных кустоў. У канцы XVIII стагоддзя паміж вежамі выкапаны абарончы вал, за ровам разбіты партэр з кветнікамі. За імі з трох бакоў замак атачае пладовы сад, падзелены рэгулярнай сістэмай алей. У канцы XIX-пачатку XX стагоддзяў у парку групамі і асобна пасаджаны экзоты. Растуць арэх шэры, хвоя веймутова, лістоўніца еўрапейская і сібірская.

**Любчанская Свята- Ільінская царква**



У 1798 г. у Любчы згарэла царква св. Іліяша.

У 1840 годзе была пабудавана драўляная Свята- Ільінская царква. Храм быў капітальна адрамантаваны (1858 год.) Ён меў форму даўгаватага крыжа з адным глухім купалам. Да прамавугольнага крыжападобнага будынка, накрытага 2-нахільнай дахам, з франтальнага боку далучаўся выцягнуты па папярочнай восі бабінец, на якім была ўзведзена 2-ярусная шатровая званіца з макаўкай. Дзвярэй было трое.

У 1910-1914 гадах на месцы старой царквы быў узведзены з цэглы новы велічны храм у выглядзе крыжа. Да квадратнага ў плане асноўнага аб'ёму з двума бакавымі прыбудовамі была далучана паўкруглая аспіда і бабінец, завершаны двух'ярусной вежай-званіцай.
Асноўны аб'ём накрыты 2-х нахільнай дахам, у цэнтры якога цыбулепадобная галоўка. Сцены прарэзаны вузкімі паўцыркулярнымі вокнамі ў выглядзе какошнікаў.
Галоўны ўваход - магутны арачны партал пад двухнаклонным дахам.
З'яўляецца помнікам архітэктуры псеўдарускага стылю.
Цяпер царква дзейнічае як прыхадская.

Збудаваны перад Другой сусветнай вайной касцел быў поўнасць разабраны ў 1980-х гг.,і на гэтым фундаменце , паўтараючы формы храма,быў пабудаваны двухпавярховы жылы дом.

Інфраструктура.

У пасёлку маецца сырзавод, сярэдняя школа, школа мастацтваў, дзіцячы сад,бібліятэка, Дом культуры, бальніца,аддзел паштовай сувязі,сетка дзяржаўных і прыватных магазінаў, дзве цырульні, Дом быту,грамадская лазня.Пры Любчанскай СШ ў 64-м годзе створаны музей гісторыі Любчанскага краю.

Любча - цэнтр СПК “ Прынеманскі”.
Гаспадарка добра вядомая на Гродзеншчыне. Год заснавання- 1989. Свой адбітак на развіцці эканомікі накладывае нядаўняе далучэнне да СПК “ Прынеманскі” дзвух суседніх гаспадарак — саўгаса «Бор» у 2003–м і СПК «Вераскава» у 2004–м. Зараз у аб’яднанай гаспадарцы амаль 700 працаўнікоў. Гаспадарка спецыялізуецца на вырошчванні зерня ,бульбы, люпіна ,рапса, яблык ,цукровых і кармавых буракоў, шматгадовых траў, гароху, кукурузы, лёну, проса, канюшыны, ячменю,збожжа.Асноўнымі відамі дзейнасці з’яўляюцца аптова-рознічны гандаль ,пераапрацоўка і вытворчасць гатовай прадукцыі: птушка , зерне,садавіна і гародніна,малочныя прадукты,сыр, масла,рыба,ягады, цукар і інш.
У СПК дзейнічаюць 3 малочна - таварныя фермы ў в.Галынь,Сенна і Бор.

Самы   вялікі валавы збор зерня атрыманы ў СПК «Прынеманскі».
Ен склаў 12 623 тоны. Развіццю гаспадаркі ў значнай ступені пасадзейнічала набыцце ў 2008 г. новых камбайнаў «Ягуар » і «Джон Дзір    ручное ткацтва, да якога вяртаюцца толькі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і да пачатку 1950-х гадоў.

З 1960-х гадоў для пашыву адзення сталі шырока выкарыстоўвацца тканіны фабрычнай вытворчасці.У наш час у жывым бытаванні амаль не засталося прадметаў традыцыйнага сялянскага адзення.Убачыць беларускі нацыянальны касцюм можна толькі ў Гарадскім Доме культуры.Аздоблены прыгожай вышыўкай, ен складаецца са спадніцы, фартуха,блузы,гарсэта і какошніка (галаўнога ўбора). Жыхарка Любчы Горбач І .С.зберагла дзіцячы нацыянальны касцюм, які належаў яе бабулі. Касцюму больш за 100 год. У яго ўваходзіць кароткая спадніца, аздобленая бліскучай вышыўкай,белая блуза і чорная накідка без рукавоў.

**Славутыя землякі**

У Любчы нарадзіліся і жылі вядомыя мастакі і кампазітары, літаратары і навукоўцы.

У Любчы XVII ст складаў і выдаваў свае творы **Саламон Рысінскі** - першы чалавек, які назваў сябе беларусам і першы збіральнік прыказак і прымавак з перакладам на самыя папулярныя еўрапейскія мовы. Тут жа, у Любчы, ён быў пахаваны.

Нарадзіўся, верагодна, у радавым маёнтку Рысін Полацкага ваяводства (Вялікае княства Літоўскае). У 1582 годзе вучыўся ў Лейпцыгу, затым выкладаў у Жамойці і Малой Польшчы. У 1586 годзе паступіў у Альтдорфскі ўніверсітэт, запісаўшыся Solomo Pantherus Leucorussus (Leucorussus з лацінскага - беларус). У лісце свайму сябру Конраду Риттерсхаузену (ням.) русскай. назваў сваю краіну - Leucorossia (з лацінскага - Беларусь). З 1596 года служыў у князёў Радзівілаў. Удзельнічаў у арганізацыі пратэстанцкай школы ў Слуцку.

У 1618 годзе выдаў першы ў свеце сход славянскіх народных прыказак і прымавак. Аўтар трактата аб паходжанні роду Радзівілаў і іншых літаратурных, філалагічных і гістарычных твораў.Імем Рысінскага названа адна з вуліц г.п.Любча.

**Мікалай Дучыц**

Мікалай Дучыц нарадзіўся 3 кастрычніка 1863 года ў сям'і Васіля і Анастасіі Дучыцаў( Дудчыцаў).Яго дзед Самуіл паходзіў з Сербіі ( Самуіл Дучыц) і ў сярэдзіне XIX стагоддзя трапіў на Мазыршчыну. Потым пераехаў на Навагрудчыну, якая зрабілася для яго другой радзімай.У 1863 годзе ў ваколіцах Міра Самуіл удзедьнічаў ў паўстанні К. Каліноўскага.

Вучобу Мікалай Дучыц пачынаў у свайго дзядзькі-настаўніка ў Троках.У 1910-1914 гг. Вучыўся ў Навагрудскім павятовым вучылішчы.Настаўнік малявання Васіль Іваненка ўбачыў схільнасці хлопчыка і стаў браць вучня з сабой на эцюды.Навагрудскі акцызны чыноўнік Аляксандр Бух, аматар мастацтва, навучаў хлопцавыпальванню па дрэву.Станаўленню мастака спрыяла і ўладальніца Любчанскага замка.

Працы мастака упершыню выстаўляліся на павятовай сельскагаспадарчай выставе ў Навагрудку ў 1913 годзе, і атрымалі высокую ацэнку.Губернская газета "Мінскі лісток"заклікала земствы дапамагчы Мікалаю ў далейшым навучанні.

У 1914 годзе юнака прынялі ў школу Таварыства заахвочвання мастакоў у Пецярбургу.У той час дырэктарам школы быў М.Рэрых, а сярод настаўнікаў-А.Бенуа,В.Федаровіч і іншыя знакамітасці.

У 1916 годзе Мікалай Дучыц мабілізаваны ў царскую армію.Са сваей часткай ён быў у Гатчыне,Дзвінску,Рызе,Шаўлях,амаль паўгода правеў у Маскве.У 1920 годзе трапляе ў Чырвоную Армію.У складзе коннага корпуса пад камандаваннем Г.Д.Гая ўдзельнічаў у паходзе на Варшаву.Корпус быў інтэрніраваны ва Усходняй Прусіі, і каля двух месяцаў прыйшлося правесці ў лагеры каля Эрлангена, дзе мастак рабіў акварэлі памерам з паштоўку і здаваў іх у мясцовую антыкварную краму.Попыт быў вялікі, і гэта давала магчымасць здабываць кавалак хлеба.Увосень 1920 года праз Эстонію інтэрніраваных вывезлі ў Пскоў.Міколу Дучыца ўразіў стары горад, і ён малюе помнікі архітэктуры.( усе працы засталіся ў Пскове).

У 1921 годзе дэмабілізуецца з арміі і марыць вярнуцца ў Навагрудак.Дабіраецца да Мінска, але заходняя частка Беларусі адышла да Польшчы, і мастаку прыйшлося затрымацца ў Мінску.Уладкоўваецца на працу на чыгунку.

Мінск стаў для мастака другой радзімай.Ён маляваў город і яго ваколіцы, хадіў вольнаслухачом на ўнівірсітэцкія лекцыі. У 1925г. прымаў удел у І Усебеларускай выставе. Мастак выкладае у школах, на Рабфаку, працуе ў рэдакцыях. У канцы 20-пач. 30 гг. ім была створана серыя пастэльных краявідаў старога Мінска.
У 1930 гады цяжка было пражыць у Савецкай Беларусі. На адной з выстаў польскі консул набыў карціну Дучыца, дзе быў намаляваны касцёл. На наступны дзень мастака выклікалі ў НКУС і патрабавалі тлумачэнняў, прымушалі прызнацца, што ў картіне зашыфравана сакрэтная інфармацыя. Былі і іншыя арышты.

У 1935г. адбылася першая персанальная выстава Мікалая Дучыца. Мастак ніколі не цікавіўся партрытам, а заўсёды імкнуўся паказаць прыроду. У 1940г. на Дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве Дучыц выставіў шэраг пейзажаў, адзначаных у прэсе.

1941 год. напад Германіі на Савецкі Саюз. Мастаку 45 гадоў, і пасля раненняў з мінулай вайны ён не падлягаў мабілізацыі. У сям'і Дучыцаў на Усходзе ні родных, ні добрых знаёмых не было. Як і большасць мінчан, яны спадзяваліся, што хутка ўвесь жах скончыўся. Немцы занялі Мінск. Усіх межчын сагналі у лагер Драздах, і пачалася праверка. Праз некалькі дзён адпусцілі творчых людзей, потым высокакваліфікаваных спецыялістаў. Міколу Дучыцу знайшлася праца у гарадскім аддзеле культуры. Палітыкай мастак не цікавіўся. Каб выжыць, творцы прадавалі свае работы, звычайна ў абмен на харчы. Такім чынам шмат твораў мастака трапіла ў краіны Еўропы ў прыватныя калекцыі.

Пасля вызвалення Беларусі савецкія улады падазрона ставіліся да людзей, якія апынуліся на акупаванай тэрыторыі, асабліва на мінчан. Многіх дзеячоў культуры, у тым ліку М.Дучыца, арыштавалі і спрабавалі абвінаваціць у супрацоўніцтве з немцамі. У 1944—45 гг. занатоўве сляды нядаўніх баёў вакол Мінска і Заслаўя. У 1946 г. былі паездкі на радзіму ў Навагрудчыну, а таксама ў Вільню, дзе ён пазнаёміўся і пасябраваўся з П. Сергіевічам. У 1954 г. была арганізавана другая персанальная выстава мастака, дзе экспанавалася звыш сотні пейзажаў.

Ў 1956 г. мастаку споўнілася 60. ён працягвае працаваць над галоўным жанрам сваёй творчасці—лірычным пейзажам. У канцы 50-х створаны першыя зімовыя краявіды, вярналася і захапленне маляванне куточкаў старога Мінска. Мгогія з малюнкаў ён падараваў Рэспубліканскай школе мастацтваў, у 1959 г. – Беларускаму Нацыянальнаму музею мастак перадаў 35 замалёвак старога Мінска і гістарычных помнікаў Беларусі.

У 1967 г. праходіць трэццяя персанальная выстава мастака. У 1973 г. больш за 10 карцін, у асноўных зімовых краявідаў, экспанавалася на выстаўцы савецкіх жывапісаў у Японіі. У 1976 г. рыхтвалася выстава да 80-годдзя з дня нараджэння мастака, але ў тыя годы ў савецкім мастацтве было на першым плане

адлюстраванне саціялістычнага будаўніцтва, а не вобраз Бацькаўшчны. Выстаўка так і не адбылася. У ноч з 2 на 3 верасня  мастак памёр ад сардэчнага прыступу.

Работы Міхася Дучыца знахадзяцца у многіх музеяў Беларусі, а таксама ў прыватных кулекцыях Беларусі, Расіі. Польшы, Японіі,Ізраіля,ЗША і іншых краін. Многія працы рэспадуцыіраваны ў часопісах, кнігах, на календарах і паштоўках.



Асобнай тэмай для размовы аб гістарычным мінулым Любчы — лёс **Мікалая Набокава**   Менавіта тут, у мястэчку Любча , у 1903 годзе нарадзіўся дваюрадны брат аўтара «Лаліты» Уладзіміра Набокава — Мікалай Дзмітрыевіч Набокаў, амерыканскі і рускі  кампазітар, сваяк Святаполк-Мірскіх, якія да 1939 года валодалі Мірскім замкам.   Мікалай Набокаў — тых жа каранёў,што і яго брат- пісьменнік. У іх агульны дзед — Дзмітрый Мікалаевіч — міністр юстыцыі ў цараванні Аляксандра Другога і Аляксандра Трэцяга; агульная бабуля — Марыя Фердынандаў,  з роду Корф. Бацькам будучага кампазітара быў Дзмітрый Дзмітрыевіч Набокаў, жанаты на Лідыі Эдуардаўне Фальц–Фэйну,у чыёй сядзібе

Любча бліз Навагрудка Мінскай губерніі прайшла палова дзіцячых гадоў Мікалая. Бацькі ў хуткім часе развяліся, і выхоўваць хлопчыка дапамагаў айчым Мікалай Федаравіч фон Пойкер (дзядзька Мікалай), суседскі памешчык,да якога ў маёнтак  Пакроўскае Мікалай з трохгадовага узросту прыязджаў,як дамоў. Менавіта ў Пакроўскім ён і пачаў музыцыраваць на старым вуглавым раялі. Раяль быў няпросты: яго, по преданию, благаславіў сам Чайкоўскі.У 1911 годзе васьмігадовага Мікалая Набокава привезлі ў Пецярбург, дзе ён час ад часу стаў бачыцца са сваім бацькам Дзмітрыем Дзмітрыевічам.

Ён аўтар першага амерыканскага балета, музыкі да балетаў, пастаўленым Рускім балетам Монтэ-Карла Джорджа Баланчын ў рамках "Рускіх сезонаў" Сяргея Дзягілева. Мікалай Набокаў напісаў шэраг араторый, сімфанічных прапаноў, фартэпіянных п'ес.

Памер 6 красавіка 1978 года ў Нью-Йорку (ЗША)



Працоўны шлях Аляшкевіча Леаніда Аляксандравіча даволі цікавы, пладатворны і на працягу апошніх 23 год звязаны з БдзМУ.

Л. А. Аляшкевіч нарадзіўся ў паселку Любча ў 1941 годзе.. У 1958 г.скончыў сярэднюю школу, у 1965 г. – санітарно-гігіенічны факультэт Харкаўскага медыцынскага інстытута. З 1966г. па 1968г. працаваў санітарным урачом абласной санітарна- эпідэміялагічнай станцыі ў Кіеве. З 1968г. па 1971г. – аспірант Кіеўскага НДІ агульнай і камунальнай гігіены. У 1972 г. Леаніду Аляксандравічу была прысвоена навуковая ступень кандыдата медыцынскіх навук. З 1975г. па 1988г. ён кіраваў лабараторыей па гігіенічнаму вывучэнню механічных фактараў  навакольнага асяроддзя Кіевскага НДІ агульнай і камунальнай гігіены. У 1986 яму была прысвоена навуковая ступень доктора медыцынскіх навук. У 1995 г. яму было прысвоена  вучонае званне прафесара.

На працягу шэрага гадоў Леанід Аляксандравіч узначальваў пры ўніверсітэце Савет па абароне доктарскіх дысертацый па спецыяльнасцям «Гігіена» і «Арганізацыя аховы здароўя і грамадскае здароўе».

Л. А. Аляшкевіч вельмі шмат сіл і энергіі аддаў ўдасканаленні педагагічнага працэсу на кафедры, навукова-даследчай працы, а таксама стварэнню метадычных рэкамендацый для ўрачоў і студэнтаў. Леанід Аляксандравіч пастаянна перадае свой велізарны досвед маладым спецыялістам і студэнтам: практычныя заняткі і лекцыі праводзіць на высокім метадычным узроўні, кіруе навуковай працай студэнтаў. Л. А. Аляшкевіч апублікаваў больш за 150 навуковых прац, прымаў удзел у распрацоўцы больш за 60 санітарных нормаў, правілаў і гігіенічных нарматываў, больш за 30 метадычных рэкамендацый для ўрачоў і студэнтаў.

За асабісты ўклад у развіццё прафілактычнай медыцыны, навукі і падрыхтоўку кадраў для санітарна-эпідэміялагічнай службы прафесар Л. А. Аляшкевіч узнагароджаны граматамі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь і Беларускага дзяржаўнага медыцынскага універсітэта.

**Соф’я Гросман**

Адна з кіраўніц амерыканскай парфумернай кампаніі IFF і аўтар сусветна вядомых духаў «Трезор» нарадзілася 8 сакавіка ў пасёлку Любча . У 15 гадоў разам з сям'ёй яна эміґравала спачатку ў Польшчу, затым - у ЗША.
Бацькі Соф’і пазнаёміліся ў 1942-ым. Тады Пётр Ходаш выратаваў сваю будучую жонку Раісу з гета. Потым яны разам ваявалі ў партызанах. Абодва ўзнагароджаны медалямі.
Статыстыка сведчыць, што прыдуманыя нашай землячкі духі «Трэзор» па колькасці продажаў перасягнулі «Шанэль № 5». Сярод персанальных кліентаў Саф’і Гросман - жонкі прэзідэнтаў ЗША, зоркі эстрады і іншыя знакамітыя аматаркі вытанчаных водараў.

***Адзначэнне Дзядоў***

Зранку ўся сям'я збіраецца ў царкву, а потым бяруць свечкі і ідуць на магілкі,каб успомніць тых, хто памер.На магілку кладуць невялікі кавалак хлеба, запальваюць свечку.Увечары ўся сям'я збіраецца ў адной хаце, засцілаюць стол белым абрусам, ставяць посуд і для сваіх памерлых продкаў.Павінна быць не менш за 12абрадавых страў. Абавязковым лічыцца гарачая страва( альбо каша,альбо тушаная капуста) Існуе павер'е, што менавіта на пар ад гарачай стравы ідуць на вячэру памерлыя продкі.Неабходна расчыніць акно альбо фортачку, каб душы продкаў бесперашкодна ўвайшлі ў хату.Прыбіраць пасля вячэры нельга . Трэба, каб свечка і стравы заставаліся на стале да раніцы.

---

Развіцце дэкаратыўна – прыкладнога мастацтва звязана з прозвішчамі многіх жыхароў паселка Любча:

Казловай Н.В. 1957 г.н. (вышыўка, вязанне, макрамэ,аплікацыя);
Шэсцель Л.І.1948 г.н. (вязанне кручком, вышыўка);
Астапкевіч А.І. 1976 г.н. (лозапляценне);
Аляшкевіч Р.А. 1943 г.н. (вышыўка ікон);
Гарбацэвіч А.П. 1931 г.н.(вышыўка рушнікоў, ткацтва,вязанне кручком)
Пронька Н.Ф. 1950 г.н. (маляванне, рэстаўрацыя карцін, разьба па дрэву)

Пры Любчанскім Доме культуры працуе дзіцячы гурток прыкладнога мастацтва. Дзеці навучаюцца саломапляценню, вязанню, вышыўцы,аплікацыі.